# Слова Жыцця



Сакавік 2017



**“ ... паяднайцеся з Богам.”**

*(2 Кар 5,20)*

**У многіх краінах свету ідуць бясконцыя крывавыя войны, якія руйнуюць сем'і, плямёны, народы.**



Распавядае  дваццацігадовая Глорыя: "Мы даведаліся, што адна вёска была спаленая, і што многія яе жыхары засталіся без усяго.



Разам са сваімі сябрамі я распачала збор неабходных рэчаў, такіх як матрацы, адзенне, прадукты...
Мы паехалі адвезці гэтыя рэчы і праз восем гадзін шляху сустрэлі тых людзей у роспачы.



Слухалі іхныя аповеды, выціралі слёзы, суцяшалі…



Адна сям'я расказала:"Наша дачка была ў доме, які згарэў. Нам здавалася, што мы памерлі там разам з ёю. Цяпер, праз вашую любоў, знаходзім у сабе сілы, каб прабачаць тых, хто вінаваты ў нашай трагедыі".





Frans Francken II, La conversione di Saulo, 1581, collezione privata

**Святы Павел таксама меў гэткі досвед. Менавіта ён - ганіцель хрысціян – зусім нечакана сустрэў на сваім шляху цалкам дармовую любоў Бога, які потым зрабіў яго прапаведнікам паяднання ў Імя Ягонае.**



Ён стаўся гарачым
і надзейным
сведкам таямніцы
Езуса, Ягонай
смерці
і ўваскрасення,
праз якія Бог
паяднаў з Сабою
свет, каб кожны
мог спазнаць
і дасведчыць
жыцця ў адзінстве
з Ім і з братамі.

Дзякуючы святому Паўлу мы маем тое, што гэты евангельскі заклік: Паяднайцеся з Богам дасягнуў і захапіў нават язычнікаў, якіх лічылі нягоднымі збаўлення.



Гэтак жа і мы, нягледзячы на памылкі, якія нас знеахвочваюць, нягледзячы на ілюзію ілжывых гарантый таго, …



… што мы без гэтага абыдземся, давайце дазволім, каб Божая міласэрнасць - гэтая бясконцая любоў - вылечыла нашыя сэрцы, каб мы былі здольныя падзяліцца гэтым скарбам з іншымі.





Так мы зможам зрабіць
свой уклад
у рэалізацыю Божага
плана супакою
для ўсяго чалавецтва
і для ўсіх стварэнняў,
плана,
які пераўзыходзіць
чалавечыя
супярэчнасці,
як казала К'яра Любіч
ў адным тэксце:

"(...) На крыжы,
у смерці Свайго Сына,
Бог даў нам
найвялікшы доказ сваёй
любові.
Праз крыж Хрыстос
паяднаў нас з Сабою.
Гэтая фундаментальная
праўда нашай веры
і сёння з'яўляецца
актуальнаю
ва ўсёй сваёй паўнаце.



**Вось адкрыццё, якога чакае ўсё чалавецтва: Бог блізкі да ўсіх сваёю любоўю і Ён любіць кожнага любоўю, напоўненаю палкасцю.**



Наш свет патрабуе, каб яму пра гэта сказалі. Аднак, мы можам абвяшчаць гэтую праўду толькі тады, калі спачатку мы абвесцім яе і будзем нагадваць пра яе самім сабе да тае пары, пакуль не адчуем сябе пагружанымі ў гэтую любоў, нават калі будзе здавацца, што ўсе абставіны супярэчаць гэтаму. (...)



Уся наша пастава павінна падцвярджаць гэтую праўду,



**і дзеля гэтага трэба паяднацца з братам ці сястрой, калі б яны мелі нешта супраць нас** *(Мц 5,23-24).* ...



Давайце любіць адзін аднаго так, як Ён палюбіў нас, без асуджэння і забабонаў, але з адкрытым прыняццем і ясным разуменнем таго, што з'яўляецца пазітыўным у нашым бліжнім, з гатоўнасцю аддаць жыццё адзін за аднаго.



Гэта самая важная запаведзь Езуса, яна павінна адрозніваць хрысціянаў, што гэтак жа важна сёння, як і ў дні першых хрысціянаў.



Жыць гэтым словам азначае стаць прыладамі паяднання".



Жывучы такім
чынам, мы
ўзбагацім нашы
дні жэстамі
сяброўства
і паяднання
ў сем'ях
і паміж сем'ямі,
у Касцёле
і паміж цэрквамі,
у кожнай
суполцы,
свецкай альбо
рэлігійнай,
да якой мы
належым.



*“ ... паяднайцеся з Богам.”*
*(2 Кар 5,20)*

Testo di *Летыцыя Магры*

Grafica Anna Lollo in collaborazione con don Placido D’Omina (Sicilia, Italia)

* * *

Il commento alla Parola di Vita è tradotto ogni mese in 96 lingue e idiomi, e raggiunge vari milioni di persone in tutto il mondo tramite stampa, radio, TV e via internet.

Per informazioni www.focolare.org

•

Questo PPS, in diverse lingue, è pubblicato su www.santuariosancalogero.org